“Чаго мне яшчэ не хапае?”

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
31.08.2014 01:00

Пад такім дэвізам з 1 па 3 жніўня 2014 г. праходзіла XIII Пешая пілігрымка з Гродна ў дыяцэзіяльны санктуарый Езуса Журботнага ў Росі. У ёй удзельнічалі больш за 240 чалавек з розных месцаў Гродзенскай дыяцэзіі, а таксама з Гомеля і Баранавічаў. Пеша я пілігрымка з Гродна ў Рось мае сваю атмасферу – атмасферу еднасці, братэрства, супольнасці, – якую ствараюць самі ж пілігрымы. У ёй пануе перакананне, што кожны для цябе брат і сястра. Таму тут не бывае канфліктаў, непаразуменняў. Удзельнікаў злучае малітва, якой навучыў сваіх вучняў Езус Хрыстус, – “Ойча наш”. Падчас яе пілігрымы бяруцца за рукі, і адчуваецца моц супольнасці, вялікай сям’і, у якую кожны, маючы свае духоўныя і інтэлектуальныя адметнасці, прыносіць частку сябе.
†

Прыемныя ўспаміны засталіся ва ўдзельнікаў ад парафій, у якіх яны спыняліся, і святароў, якія там служаць. Пачастункі, начлегі, разуменне, гасціннае прыняцце – гэта дадавала ім сіл, каб ісці наперад. Удзельнікі пілігрымкі вярнуліся дадому пасля яе заканчэння, прайшоўшы доўгі шлях, апаленыя гарачым сонцам. Але скончаная пілігрымка не азначае заканчэння жыццёвага пілігрымавання: яно працягваецца, бо вернікі штодзённа крочаць на працу, вучобу, вяртаючыся да пытання: “Чаго мне яшчэ не хапае?”. Нам, напэўна, усё ж такі яшчэ не хапае адвагі, не хапае веры... Тут прыгадваецца прыпеў з песні: “За тое, што так мала люблю, за тое, што так мала служу, за тое, што так мала веру, прашу прабачэння ў Цябе!”.